ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO. 48 (3552) ● ● ЧАЦВЕР, 21 СНЕЖНЯ, 2017

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**Вандроўка на зямлю продкаў**

Фільм пра падарожжа ў Беларусь супляменнікаў з Паўладара з’явіўся на папулярным сайце YouTube Стар. 2



**Блізкія рэчы з далёкіх часоў** Стар. 3



**Галерэя таленавітых сяброў**

Мастацкая галерэя “Універсітэт культуры” актыўна рэалізуе разнастайныя творчыя праекты з беларусамі замежжа Стар. 4

ТРАДЫЦЫІ

# Скарбы добрых спраў

## У Цюмені шырока і прыгожа святкаваўся 20-гадовы юбілей Нацыянальна-культурнага таварыства “Аўтаномія Беларусь”

З вышыні гадоў заўсёды цікава глядзець на пройдзены шлях: што зроблена, як рухаца далей? У Цюмені ж да юбілею суполкі прымеркаваныя былі сёлетнія Дні беларускай культуры, якія праходзілі па вобласці з 22 кастрычніка па 2 снежня. На розных пляцоўках ладзіліся сустрэчы, канцэрты, выставы… Дзякуючы ім ахвотныя маглі знаёміцца з узорамі беларускай культуры, больш даведацца пра святы, звычаі, абрады беларусаў у Сібіры. У прыватнасці, пра пераемнасць традыцый, повязь пакаленняў сведчыла выстава “У промнях сонца”, што ладзілася ў сяле Дзясятава Ішымскага раёна: дэманстраваліся лепшыя працы юных мастакоў з мясцовай Дзіцячай студыі дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Вясёлка”. У вёсцы Ермакі Вікулаўскага раёна прыцягнула ўвагу этнаграфічная выстава “У пошуках мінулага”: энтузіясты збіраюць там прадметы побыту беларусаў-самаходаў канца XIX—пачатку XX стагоддзяў. І ў вёсцы Новабярозаўцы Арамашаўскага раёна выстава “Сцяжынкамі продкаў” таксама прысвечана самаходам, у якіх беларускія родавыя карані.



НАТАЛЛЯ ГАБРУСЬ

Першае знаёмства з выцінанкай



Цюменьскія беларусы М. Піскун і В. Кашаед

Што да канцэртаў, то згадаем найперш юбілейны “Люблю цябе, родная Белая Русь!”: ён прысвячаўся 15-годдзю Моладзевага ансамбля беларускай музыкі ды песні “Палессе” (мастацкая кіраўніца — выпускніца Беларускай дзяржкансерваторыі Тамара Грыгор’ева). У Цюмені, у канцэртнай зале Палаца нацыянальных культур “Строитель” гучалі народныя і эстрадныя песні, найгрышы на баяне, гармоніку, цымбалах, былі прадстаўлены й беларускія танцы. А ў сяле Дзясятава прайшла святочная дзея “З глыбінь народных”, пад час якой ансамблі беларускай песні “Бярозка” ды “Жывіца” знаёмілі гледачоў з гісторыяй, абрадамі, звычаямі, традыцыямі, песнямі беларусаў-самаходаў вобласці. Вядомы й за межамі вобласці Народны ансамбль беларускай песні “Лянок” даў канцэрт “У гучанні музыкі — народны пачатак”.

А якая прыгажосць і сіла ў беларускіх народных святах! Пад час Дзён у вобласці прайшло свята ўрадджаю Багач — у вёсцы Навалокці, што ў Ішымскім раёне. Беларускія гурты “Лянок”, “Спадчына”, “Сузор’е” натхнёна спявалі як жніўныя песні, так і пра Бацькаўшчыну, каханне, сям’ю, да таго ж правялі на вясковай вуліцы абрад Багач. Ён глыбокі па сэнсе, яркі, прыгожы. (Пра тое, як праводзяць Багач беларусы ў Іркуцку — гл.: “Жывы агонь даўніх традыцый” (ГР, 6.11.2014). — Рэд.). А ў Заводаукаўскім раёне, у вёсцы Лыбаева беларусы правялі старадаўні абрад памінання продкаў Дзяды.

Згадаем гімназіі ды школы — там таксама беларусам рады, і шэраг імпрэзаў ладзіўся для дзяцей і падлеткаў. Напрыклад, у 5-й гімназіі Цюмені прайшла канцэртная праграма “Добры дзень таму, хто ў гэтым даму”, прысвечаная святу Багач. Беларусы расказалі пра яго адметнасці, гучалі адпаведныя песні, гімназісты паўдзельнічалі ў самім абрадзе. У 37-й школе Цюмені ладзілася праграма “Традыцыі і рамёствы” — для вучняў малодшых класаў. Спецыялісты па беларускай культуры з Цэнтра нацыянальных культур шмат цікавага расказалі дзецям, вадзілі з імі карагоды, паказалі вырабы з саломкі, вышыўкі, выцінанкі. У 5-й ды 16-й гімназіях тэматычныя сустрэчы прайшлі пад назвай “У сям’і беларусаў” — прысвячаліся яны сямейным традыцыям, асаблівасцям выхавання, побыту беларусаў. Гаварылі, чаму шмат было ў Цюменьскай вобласці беларусаў-самаходаў, гучалі песні на беларускай і рускай мовах, ладзіліся беларускія гульні. У школах, гімназіях звярталі ўвагу на тое, што расіяне і беларусы маюць агульны Дзень народнага адзінства, дэманстраваўся відэаролік “Расія — Беларусь”.

→ Стар. 2

ВЕСТКІ

## Інтэлектуальны рэсурс

Іван Іванаў

**На другім З’ездзе беларускіх вучоных, які прайшоў у Мінску, прынята Стратэгія навукова-тэхнічнага развіцця краіны: “Навука і тэхналогіі: 2018—2040”**

Зауважаеце, як апошнім часам у свеце бурна развіваецца электратранспарт? Тэндэнцыя, трэд… А ўсё таму, што — і глабальнае пацяпленне, і ў эканоміцы — арыентацыя на “зялёныя тэхналогіі”, а яшчэ — цэны на паліўна-энергетычныя рэсурсы танцуюць, ды й радовішчы газу й нафты вычарпальныя. Вучоныя даўно сцвярджаюць: інтэлектуальныя рэсурсы — больш даўгавечныя. Больш тэхналагічныя. Ну і гэтак далей. Таму й выбірае Беларусь — новыя тэхналогіі, шлях інавацыйнага развіцця айчыннай навукі.

Пра тое, якія навуковыя кірункі найперш варта развіваць, улічваючы выклікі часу, як наладзіць эфектыўнае ўкараненне ў вытворчасць новых распрацовак ды шмат пра якія іншыя праблемы гаварылі госці, дэлегаты другога З’езда вучоных Беларусі, які праходзіў у Мінску 12-13 снежня. У форуме, як паведамлялі СМІ, паўдзельнічала 2,6 тыс. чалавек, у тым ліку й замежныя госці. Прыехалі дэлегаты з усіх рэгіёнаў краіны, а таксама вядомыя вучоныя Саюзнай дзяржавы, СНД, вядучых замежных акадэмій навук, сусветных навукова-даследчых арганізацый і цэнтраў.

У першы дзень з’езда дзевяць яго секцый працавалі на розных пляцоўках Мінска. На другі дзень выстава дасягненняў вучоных разгарнулася ў Палацы Рэспублікі, дзе праходзіла пленарнае пасяджэнне. На ім выступіў з прамовай Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

АБРЫСЫ БУДУЧЫНІ

# Цёплыя зімы, гарачыя леты

Іна Ганчаровіч

**Нататкі пра пацяпленне клімату, прагнозы навукоўцаў і тое, ці будуць у Беларусі праз 100 гадоў расці пальмы, манга і бананы**

Што адбываецца з надвор’ем? Летам бывае пад 40, а суровыя зімы з сапраўднымі снежнымі гурбамі — даўно ў мінулым. З такімі пагоднымі выкрунтасамі, можа, і сапраўды гадоў праз 100 Беларусь ператворыцца ў трапічную краіну? Зрэшты, пра глабальнае пацяпленне, парніковы эфект сёння пішуць шмат і па-рознаму. Адны звязваюць пацяпленне з вынікамі гаспадарчай дзейнасці чалавека, іншыя кажуць пра натуральныя працэсы й цыклічнасць у клімаце Зямлі. Адно відавочна: трэба прыстасоўвацца да новых кліматычных умоў.

У Беларусі пацяпленне клімату прыкмячаюць з канца 80-х, асабліва ўзімку. Дзе падзеліся зімы снежныя, марозныя? Вось пішу пра тое — снежань за вакном, каля нуля на тэрмометры і мокра на тратуарах. Баюся, нашы ўнукі-праўнукі хутка будуць радавацца снегу як нечаму незвычайнаму й рэдкаму… І зменьваецца ж не толькі карцінка за вакном, але й усе астатнія звёны прыроднага ланцужка: жывёлы, расліны, рыбы, насякомыя. У беларускіх лясах, палях і рэках з’явіліся чужынцы-прыхадні з паўднёвых рэгіёнаў, зніклі расамаха, паўночны алень, “перасяляюцца” ад нас на поўнач елка, глушэц, цецярук. Змены — істотныя: на поўдні Беларусі ёсць новая агракліматычная зона, якая адпавядае лесастэпам Украіны. Вось якая кліматычная разбалансіроўка. І адбылося парушэнне балансу цяпла й холаду, паводле афіцыйнай інфармацыі, за 25 гадоў, пры павелічэнні сярэднегадавой тэмпературы ўсяго на 1,3 градуса. А калі дадасца некалькі градусаў?



Навукоўцы з брытанскага MetOffice, аналаг Гідраметцэнтра, склалі карту кліматычных змен з прагнозам да канца стагоддзя. Паспрабавалі разлічыць: як глабальнае пацяпленне адаб’ецца на жыцці зямлян, і як будзе выглядаць у розных краінах сельская гаспадарка, рыбалоўства, экспарт-імпарт прадуктаў, ежа. Мы ж да карты брытанцаў дададзім трохі прагнозаў беларускіх вучоных, дзеянняў аграрыяў ды меркаванняў звычайных жыхароў Беларусі.

→ Стар. 4

РЭХА ПАДЗЕІ

# Вандроўка на зямлю продкаў

## Фільм пра падарожжа ў Беларусь супляменнікаў з Паўладара з'явіўся на папулярным сайце YouTube

**Кацярына Мядзведская**

З семярых артыстаў Народнага моладзевага вакальнага ансамбля "Надзея" з казахстанскага Паўладара, што ўдзельнічаў сёлета ў трэцім Фэсце мастацтваў беларусаў свету, пяцёра пабывалі ў Беларусі ўпершыню. Кіраўніца гурту Таццяна Пучок і адзін з салістаў Іван Нечапурэнка прыязджалі да нас і тры гады таму, на папярэдні фэст. У Казахстан у сярэдзіне мінулага стагоддзя пераехалі жыць яшчэ дзядулі-бабулі малодых спевакоў. Вядома, што ў 50-60-х поўным ходам ішло асваенне цалінных зямель. І хоць у некаторых сёлетніх гасцей з Паўладара ёсць родныя ў Беларусі, але сувязі з імі падтрымліваюцца пераважна віртуальныя: скайп, электронныя пісьмы, тэлефон.



Народны моладзевы вакальны ансамбль "Надзея" ў Мінску, ля Траецкага прадмесця

У знятым жа артыстамі фільме пра падарожжа ў Беларусь юнакі не хаваюць сваіх пачуццяў: рады сустрэчы з зямлёй прадзедаў. Вось, ідучы па праспекце Незалежнасці ў Мінску, называюць беларускую сталіцу прыгожай і велізарнай. Максім Смакоцін ды Яўген Трыстан увогуле не супраць застацца жыць тут. А Каця Сімікіна задумваецца: ці не паступіць ёй пасля школы ў які-небудзь беларускі ўніверсітэт.

Сёлетняя вандроўка ў Беларусь для іх з Паўладара пачалася... з выступлення ў нацыянальным павільёне на выставе "ЭКСПА-2017" у Астане. І публіка, бачна тое па кадрах фільма, іх цёпла прымала. Некаторыя нават пыталі: ці не знакамітыя беларускія "Харошкі" выступаюць? Ансамбль "Надзея" тройчы радаваў гледачоў спевамі ды танцамі на грандыёзнай сусветнай экспазіцыі — і штораз паспяхова. "Мне не сорамна за калектыў, што прыехаў на трэці Фэст мастацтваў беларусаў свету, — казала мне ў час святочных дзеяў кіраўніца суполкі "Беларусь" Любоў Богнат. — І хоць усе маладыя артысты з ансамбля "Надзея" нарадзіліся ў Казахстане, гэта — сапраўдныя, шчырыя беларусы. Кажучы словамі з гімна, яны "сэрцам адданыя роднай зямлі". Хлопцы і дзяўчаты ў нашай суполцы вывучаюць мову, прыгожа чытаюць вершы Якуба Коласа, Янкі Купалы... А як хваляваліся перад сустрэчай з зямлёй продкаў!.."

Відаць, таму, што сустрэча з Бацькаўшчынай была сапраўды доўгачаканай, здымалі госці на камеру амаль кожны свой крок: едуць у аўтобусе ў гасцініцу, засяляюцца... Пасля — выступленні "Надзеі" ў Белдзяржфілармоніі ды Верхнім горадзе, каля Ратушы. Паездка на Магілёўшчыну, Бабруйск, Нясвіж, непаўторныя краявіды Лагойшчыны і, канешне, прагулка па Мінску — усё гэта ёсць у фільме.

А Любоў Богнат падзялілася са мною навіной: "Нядаўна гурту "Надзея" было нададзена званне народнага. Адпаведны дакумент за подпісам Міністра культуры Казахстана — у нашым офісе на ганаровым месцы. Гурт цалкам абнавіў рэпертуар. Вялікую праграму, на паўтары гадзіны, мы прадставілі ў Беларусі". Прычым моцная ў ёй інструментальная частка. Гармонік, балалайку, флейту, мандаліну музыкі прывезлі з сабой. А энергетыка ў калектыву такая, што, як кажуць, дух захоплівае!

Дарэчы, у сям'і спевака Івана Нечапурэнкі повязі з Беларуссю не толькі крэўныя, але й творчыя. У 1992-м Народны вакальна-інструментальны ансамбль "Арфей" з Паўладара, кіраваў якім Віктар Баланюк (дзядуля Івана!), заняў першае месца на Міжнародным фестывалі "Славянскі базар у Віцебску". А цяпер традыцыі культурных, сяброўскіх сувязяў паміж дзвюма краінамі прадаўжае ўнук.

ТРАДЫЦЫІ

# Скарбы добрых спраў

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Тамара Грыгор'ева, кіраўніца гурта "Палессе", адзначае: Дні беларускай культуры — гэта штогод значная падзея ў культурным жыцці вобласці. Актывістам беларускага руху цікава працаваць у школьных, маладзёжных аўдыторыях: там да беларусаў ёсць інтарэс. А сустрэчы праходзяць шумна й весела, у гульнявой форме, з выкарыстаннем наглядных матэрыялаў, з музыкай, песнямі.

Завяршаліся Дні беларускай культуры ў Цюмені, у Палацы нацыянальных культуры "Строитель": вялікім святочным гала-канцэртам "З імгненняў складваюцца лёсы", з запрашэннем актывістаў іншых дыяспар, нашчадкаў беларусаў-самаходаў з аддаленых вёсак вобласці. Старшыня праўлення таварыства "Аўтаномія Беларусь" Марыя Піскун, яе паплечнікі шмат папрацавалі, каб усё прайшло як мае быць. Сама ж энтузіястка, цудоўная спявачка, салістка сямейнага гурта "Спадчына", лічыць: гэта яркая, захапляльная імпрэза штогод зараджае многіх стваральнай энергіяй, дае сілы, нягледзячы на розныя выклікі жыцця й часу, годна, прыгожа, з песняй беларускай ісці па жыцці. Сёлета ж да святочнай дзеі далучыліся многія гурты: "Акварель", "Сузор'е", "Жывіца", "Вясёлка", "Лянок", "Палессе", "Спадчына", "Вячоркі", "Россияночка". Выходзілі на святочную сцэну й маладыя таленавітыя салісты. На думку спадарыні Марыі, гэта, як і багатая праграма Дзён, сведчыць пра здароўе і прыгажосць беларускага руху, пра вялікі патэнцыял таварыства "Аўтаномія Беларусь".

Са сцэны гучала шмат добрых слоў, віншаванняў. Актывісты беларускага руху атрымалі граматы, падзякі, выступалі творчыя калектывы. А ў прасторным вестыбюлі Палаца госці разглядалі творы на выставе дэкаратыўна-прыкладной творчасці, каштавалі дранікі ды іншыя беларускія стравы.

На адрас Марыі Піскун паступіла шэраг віншавальных тэлеграм. За добрасумленную працу падзякі ад старшыні Цюменьскай абласной Думы атрымалі абласная грамадская арганізацыя "Саюз — інтэграцыя братэрскіх народаў" (ёй кіруе Уладзімір Шугля) і таварыства "Аўтаномія Беларусь". Падзячныя пісьмы актывістам беларускага руху ў Цюмені даслаў Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Беларусі Леанід Гуляка. У прыватнасці, адзначаны Народны самадзейны калектыў — вакальны ансамбль беларускай песні "Лянок" (мастацкі кіраўнік Клаўдзія Зуева), Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль "Вячоркі" (Валянціна Міхіенка), Народны фальклорны ансамбль "Россияночка" (Надзея Вычужаніна), Вакальны сямейны ансамбль "Спадчына" (Надзея Падкарытава). Ушанаваны й актывісты дыяспары: старшыня Цюменьскай гарадской грамадскай арганізацыі "Нацыянальна-культурная аўтаномія беларусаў"



НАТАЛЛЯ ГАБРУСЬ

Беларускія стравы на святe ў Цюмені

Наталля Габрусь, старшыня Мясцовай грамадскай арганізацыі "Нацыянальна-культурная аўтаномія беларусаў горада Табольска" Уладзімір Габрусь, старшыня Рэгіянальнай грамадскай арганізацыі "Нацыянальна-культурная аўтаномія беларусаў Цюменьскай вобласці" Мікалай Сапега, вядучы спецыяліст аддзела па ўзаемадзеянні з палітычнымі партыямі, грамадскімі аб'яднаннямі й прафілактыцы экстрэмісцкіх праяў Камітэта па справах нацыянальнасцяў Цюменьскай вобласці Сяргей Яфімчык.

Вішаванні супляменнікам, а таксама й падзячнае пісьмо ў Цюмень даслала дырэктарка Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Мінкультуры Беларусі Вольга Антоненка. Пасол Беларусі ў Расіі накіраваў Падзячныя лісты на адрас ансамбляў: адзначаны вядомыя гурты "Жывіца", "Сузор'е", "Бярозка", Вакальная дзіцячая студыя "Вясёлка", а таксама Студыя дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Вясёлка", Ансамбль беларускай музыкі й песні "Палессе".

Зрэшты, усе віншаванні-падзякі, якія заслужылі актывісты беларускага руху, і не пералічыць. Сёння аб'яднанне "Аўтаномія Беларусь" — гэта вялікая дружная сям'я, у якой кожны імкнецца нешта рабіць на карысць беларускай культуры. Спадзяемся, і надалей газета будзе расказваць пра іх на сваіх старонках: энтузіясты вартыя таго. А дзякуючы публікацыям пра залацінкі добрых спраў цюменьскіх беларусаў будуць ведаць і на гістарычнай Бацькаўшчыне.

**Людміла Бакланава, Наталля Габрусь,** г. Цюмень

ВЕСТКІ

# Свой голас і свой твар

**Рыгор Арэшка**

**Знакавыя міжнародныя праекты ў Вялікім тэатры Беларусі прыцягваюць увагу публікі напярэдадні Каляд і Новага года**

Рознымі шляхамі пашыраецца інфармацыя пра нашу Бацькаўшчыну ў свеце. Пра Мінск усё часцей гавораць і як пра горад, у якім праходзіць Калядны оперны конкурс маладых выканаўцаў. Калегі з Вялікага нам паведамілі: 111 удзельнікаў з 16 краін прыехалі ў Мінск. Сёлета, як і раней, найбольш удзельнікаў з Расіі, Беларусі ды Украіны. Прыехалі спевакі з Грузіі, Казахстана, Арменіі, Ізраіля, ЗША, Малдовы, Латвіі, Кітая, Азербайджана, Францыі, Эстоніі. Пераважаюць сапрана, менш мецца-сапрана, тэнараў, барытонаў і басоў. І ёсць два басы-барытоны.

На сходзе, якім адкрываўся конкурс, да яго ўдзельнікаў звярнуўся генеральны дырэктар Вялікага тэатра Уладзімір Грыдзюшка. Ён нагадаў, што конкурс ужо чацвёрты па ліку, і паўдзельнічала ў ім больш за 400 спевакоў. Дзякуючы ў тым ліку й мінскай сцэне многія з іх здабылі ўжо вядомасць, папулярнасць на сусветных оперных пляцоўках. Але самае галоўнае, лічыць Уладзімір Паўлавіч, што Калядны конкурс вакалістаў у Мінску атрымаў свой твар. На ім пануе непаўторная творчая атмасфера, самі ўдзельнікі сведчаць пра аб'ектыўнае судзейства журы.

КОЛА ЖЫЦЦЯ

# Блізкія рэчы з далёкіх часоў

## Збіральнікі-энтузіясты, калекцыянеры дапамагаюць наладзіць каштоўны дыялог паміж пакаленнямі, больш даведацца пра гісторыю Бацькаўшчыны



**Дзмітрый Сурскі**

Напярэдадні Новага года ўсім хочацца прыўнесці ў жыццё абнаўленне. І калі ўсчынаем чарговае парадкаванне жыццёвай прасторы, то заўважаем: як шмат вакол нас цікавых, дарагіх нам рэчаў! Калі ўдумацца, прыгледзецца, то знойдуцца й сапраўдныя рарытэты, якія спалучаюць нас з мінулым ды люструюць частку супольнай гісторыі, культуры. А бывае й так, што артэфакты, прадметы матэрыяльнай спадчыны натхняюць энтузіястаў і на стварэнне музеяў. Скажам, у Гродне ёсць Музей праса — першы ў Беларусі праект такога кшталту. Там больш за 300 самых розных прасаў! А вы чулі пра гродзенскі прыватны "Музей побыту" калекцыянера Януша Паруліса? Экспануюцца тысячы экспанатаў, звязаных з вясковым побытам, школай, мастацтвам, фота- і кінатэхнікай, а сам Януш з ахвотай праводзіць экскурсіі.

Пра каго б яшчэ з энтузіястаў-калекцыянераў варта было сказаць? Нямала ў СМІ матэрыялаў пра шматбаковую падзвіжніцкую дзейнасць калекцыянера-філакартыста Уладзіміра Ліхадзедава. Менш вядома пра Ігара Сурмачэўскага з Мінска, які збірае, рэстаўруе старабеларускія абразы. Дзякуючы яго стараннням адноўлены такія адметныя праваслаўныя абразы Беларусі, як Ружанская Божая Маці Адзігітрыя XVII ст. і Дзісненская Адзігітрыя XVI—XVII стагоддзяў. Аднойчы, ведаю, калекцыянер уратаваў ад вывазу ў замежжа цудатворны абраз Божай Маці, які напрыканцы XVIII ст. апошні ваявода Мінска Адам Хмара падараваў касцёлу ў сяле Дуброва. Найбольш актыўна майстар займаецца палескімі абразамі XVIII—XIX стагоддзяў, збіраецца пісаць пра тое кнігу. Ёсць у зборах Ігара Сурмачэўскага й рэчы часоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, у асноўным прадметы шляхты: пячаткі, дакументы, пісьмы, карты, кнігі, посуд, жывапіс і гравюры. Некаторыя экспанаты, уратаваныя калекцыянерам, дэманструюцца ў музейных залах Беларусі. Напрыклад, шляхецкі жаночы гардэроб XIX—XX стагоддзяў — у мінскім "Доме Ваньковічаў".

Пра калекцыяванне ў Беларусі шмат цікавага ведае старшыня Беларускага саюза дызайнераў Дзмітры Сурскі, сам збіральнік з дзяцінства. Збіраў фанцікі ад цукерак, пазней — упакоўкі ад цыгарэт рэдкіх, як цяпер кажуць, брэндаў. З тых упаковак, дарэчы, Дзмітры стварыў пацешнага робата. Згадвае, з якім імпэтам даследаваў у дзяцінстве змесціва сарайчыка паблізу дома. Пэўна, якраз тыя дзівосныя знаходкі й падштурхнулі хлопчыка да калекцыявання. Бо знайшоў там цацачныя цягнікі, нажніцы, інструменты. І прыгожыя, унікальныя рэчы траплялiся. З часам прыйшлі ў жыццё паштовыя маркі: флора і фаўна. Тое "першае сур'ёзнае" ды асэнсаванае "калекцыяванне" доўжылася гадоў шэсць. У студэнцкія гады цікавасць да збірання рэчаў толькі ўзрасла. Тады ж яму пашанцавала пабываць у пасёлку, які йшоў пад знос, ды ў старых хатах знайсці, уратаваць каштоўныя артэфакты — нават беларускую тэатральную афішу 1883 года. Яна й цяпер — упрыгажэнне каштоўнай калекцыі, якую Дзмітры з вялікім захапленнем збірае.

Акрамя плакатаў, найбольш яму цікавыя нажніцы, эмаляваны посуд. Нажніц у калекцыі — каля 150: медыцынскія, манікюрныя, цырульныя, швейныя, маленькія-вялікія... Прыцягваюць увагу як старыя мадэлі, так і сучасныя. Чаму ўзнік такі вось інтарэс? Раней Дзмітры быў кіраўніком тэмы і распрацоўваў шырокі асартымент нажніц у Інстытуце тэхнічнай эстэтыкі. Было ў дызайнера некалькі запатэнтаваных вынаходак, якія таксама ёсць у ягонай калекцыі.

Што да эмаляванага посуду, то яго, кажа, складана знаходзіць. Такі посуд каштаваў даволі танна, і калі псаваўся, то яго выкідвалі. А нешта й ацалела ў хвалях часу. У калекцыі Дзмітрыя Сурскага ёсць эмаляваныя званочак, лейка, шыльды з назвамі вуліц, вартаўнічок для малака (каб не збягала пры кіпячэнні), кружка з сімволікай маскоўскай Алімпіяды-80. Ёсць і рэчы без штампа — прадукцыя арцеляў. Асаблівую ўвагу прыцягвае кавярнік, зроблены ў Гомелі ў 1956 годзе: формай нагадвае вядомыя еўрапейскія пачатку ХХ стагоддзя. Але гэта выраб айчынны. Дзмітры ўдакладняе: такія прадметы добра дэманструюць старую тэхналогію, яе ўнікальнасць.




**Адзін з плакатаў Дзмітрыя Сурскага**

Цікавая ў Дзмітрыя й калекцыя жывапісу, з асаблівай увагай на эцюды. Ёсць у зборы эцюды, што выйшлі з-пад рук Барыса Заборава, Ізраіля Басава, Ліпы Кроля, Юзэфа Пучынскага, Віталя Цвірко. Там і працы сяброў дызайнера: Аляксандра Сільвановіча, Аляксандра Вахрамеева, Дзмітрыя Маслія, Сяргея Малішэўскага ды іншых. Пра калекцыю ўладальнік згадвае з цеплынёй і любоўю, любіць тыя творы часам разглядаць.

Марыць Дзмітры Сурскі пра тое, што ў Беларусі будзе вялікі Музей прыватных калекцый. Бо ёсць што паказаць! І падобныя музеі ўжо ёсць у свеце. А будзе музей — будзе куды аддаць рэчы, якія чамусьці замінаюць гаспадарам, "шукаюць новае месца жыхарства". І не ўсе ж калекцыянеры маюць магчымасць запрашаць да сябе цікаўных, каб зборы паказаць. Музей — гэта і выхад на сусветны ўзровень, магчымасць працаваць з турыстамі, гуртаваць аднадумцаў. І было б нядрэнна, разважае далей Дзмітры, прыносіць на "ночы музеяў" рэчы — музеям у дар. І фарміраваць калекцыі з даступных прадметаў — ужо сёння: з тых рэчаў, якія звязаны з матэрыяльнай культурай, дызайнам Беларусі. Такія рэчы ёсць у крамах, іх выпускаюць на беларускіх прадпрыемствах — можна паказваць найбольш цікавыя экзэмпляры. Так што разам з Музеем прыватных калекцый было б няблага стварыць і Музей дызайну, і Музей тэхнікі — у Беларусі ж моцная вытворчая база. Карацей, прастора для дзейнасці — неабсяжная.

Асабіста для Дзмітрыя калекцыяванне — хобі, якое прыносіць вялікую радасць. Занятак спалучаны з прафесійнай зацікаўленасцю, дапамагае ў працы. Калекцыі ўдзельнічалі ў выставах, яны натхняюць на вывучэнне матэрыяльнай культуры Бацькаўшчыны. У прыватнасці, рэалізаваны праект Беларускага саюза дызайнераў "Back to USSR", дзе былі прадстаўлены артэфакты эпохі, праведзена выстава рарытэтных швейных машынак. У калекцыі Дзмітрыя ёсць прадметы яго аўтарства: і згаданыя ўжо нажніцы, і плакаты. Ён займаецца рэстытуцыяй, вяртаннем у Беларусь рарытэтных беларускіх плакатаў. У свой час значная іх частка была згублена ў Расіі, цяпер дызайнер выкупляе творы, якія там захаваліся, у асноўным іх якасныя лічбавыя копіі.

Пад Новы год не варта спяшацца, парадкуючы рэчы, выкідваць усё нам непатрэбнае на сметніцу. Магчыма, нешта спатрэбіцца калекцыянерам. А калекцыйная справа ў Беларусі жыве даўно: згадаем хаця б графа Эмерыка фон Гутэн-Чапскага, на аснове калекцыі якога працуе ўнікальны музей у польскім Кракаве. Адкрыты ж ён недалёка ад цэнтра горада: на вуліцы Ю. Пілсудскага, 12. "У 1894-м свой каштоўнейшы музейны скарб у шасці таварных вагонах граф перавёз са Станькава ў Кракаў, які быў на той час па-за межамі Расійскай імперыі", — піша пра тое краязнаўца Лявон Целеш. (Больш падрабязна гл.: "Падарожжа ў Кракаў. — ГР, №30, 10. 08. 2017). Дарэчы, у інтэрнэт-вікіпедыі ёсць артыкул "Беларускія калекцыянеры". Шэрагі руплівых збіральнікаў немалыя й сёння. Мне вядома, напрыклад, пра Уладзіслава Заленскага з Міншчыны, які збірае старабеларускія рэчы з сямігадовага ўзросту. За восем гадоў Уладзіслаў стварыў Музей беларускага по быту ў вёсцы Старая Падваложка Бярэзінскага раёна.

Повязь часоў, дыялог пакаленняў, спадчына, след на зямлі... Дзякуючы збіральнікам, калекцыянерам нам удаецца больш поўна захаваць згадкі-ўспаміны пра мінуўшчыну Бацькаўшчыны, нібыта пачуць галасы таленавітых папярэднікаў, ацаніць плён іх працы, стваральныя намаганні, павучыцца майстэрству. А часам і знайсці, спасцігаючы сутнасць старых рэчаў, каштоўныя падказкі для ўласных праектаў на будучыню.

**Марыя Мініч,**
мастацтвазнаўца

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

# Такія святочныя строі

**Народнаму касцюму прысвяціла прыгожую вечарыну Екабпілскае беларускае таварыства "Спатканне"**

Непаўторнае "Свята народнага касцюма" прайшло ў Екабпілсе, слаўным горадзе на берагах Даўгавы. Сябры-беларусы запрасілі на яго й дэлегацыю Даўгаўпілскага Цэнтра беларускай культуры. Ладзілі свята суполка "Спатканне" і Дзённы цэнтр "Разам быць" у плыні культурнага праекта "Знойдзем, параўнаем, захаваем для Латвіі": ён прымеркаваны да 100-годдзя Латвійскай Рэспублікі.

Тэма народнага касцюма — сакральная. Ужо не толькі навукоўцы лічаць, што нацыянальны касцюм — гэта неацэнная гістарычная спадчына, багацце й самабытнасць народа. З такім падыходам і былі прадстаўлены латышскія, беларускія, рускія, украінскія строі, паказаны іх адметнасці ды падабенствы.

Беларускі касцюм, маючы агульныя карані з рускім і ўкраінскім, фармаваўся ва ўзаемаўплывах латышскай, літоўскай, польскай, рускай і ўкраінскай традыцый. Ды ўсё ж ён — самабытны: унікальная з'ява. Узяць, скажам, тэхнікі афармлення: вышыўка, узорнае ткацтва, карункі, аплікацыя... У Беларусі гістарычна склаліся 22 варыянты этнакасцюма, рэгіянальныя ж адрозненні ў асноўным палягаюць у дэталях, матывах і сюжэтах арнаменту, спосабах нашэння асобных частак касцюма, у каляровай гаме. Раней, дарэчы, па касцюме й вызначалі, з якой мясцовасці чалавек, яго сямейнае становішча, прыкладны ўзрост.

На свяце дэлегацыі прадстаўлялі свае касцюмы, расказвалі пра іх. Гаспадары прадставілі на суд гледачоў цікавую відэапрэзентацыю, паказалі дэфіле як фабрычных мадэляў, так і касцюмаў, пашытых уласнымі рукамі па сваіх жа эскізах. Дэлегацыя з Ліван паказала славянскія касцюмы, у тым ліку й пашытыя ўласнаручна.

І мы прыехалі прыгожа. Кіраўніца ЦБК Жанна Раманоўская — у касцюме Віцебскага рэгіёну (гістарычная рэканструкцыя), расказала яна й пра адметнасці мужчынскага й жаночага адзення. У камплект жаночага касцюма ўваходзяць кашуля, спадніца, фартух, пояс, безрукаўка, галаўны ўбор. Кашуля — з даматканага палатна. Тканымі ці вышытымі ўзорамі з чырвонай ці чырвона-чорнай пражы ўпрыгожваліся рукавы, плечы, каўнер, манжэты. Спадніца — ваўняная ці льняная, былі самыя розныя колеры і ўзоры, пераважна клетка й паласа. Сакральны элемент — пояс — мог быць тканым, плеценым ці вязаным, багата ўпрыгожваўся арнаментам. У тэму прагучаў ад нас і верш Максіма Багдановіча "Слуцкія ткачыхі" на беларускай мове, а таксама ў перакладзе на латышскую.



МАРЫЯ ПАМЕЦЬКА

**На свяце ў Екабпілсе**

Прэзентацыя, прадстаўленне касцюмаў, іх апісанне й дэфіле чаргаваліся музычнымі нумарамі — іх паказалі як екабпілскі ансамбль "Завіруха", так і госці: вакальны гурт "Пралескі" з Даўгаўпілса і прадстаўнікі Ліванскага славянскага таварыства "Узоры". Мы, даўгаўпілсцы, вельмі ўдзячны кіраўніцы суполкі "Спатканне" Валянціне Дарашчонак — за тое, што зладзіла цудоўнае свята й нас хораша, з душою прыняла. Дарэчы, беларусаў Даўгаўпілса і Екабпілса звязваюць даўнія партнёрскія стасункі.

**Марыя Памецька,**
Екабпілс — Даўгаўпілс

РАДАСЦЬ ТВОРЧАСЦІ

# Галерэя таленавітых сяброў

## Мастацкая галерэя “Універсітэт культуры”, якой нядаўна споўнілася 15 гадоў, актыўна рэалізуе разнастайныя творчыя праекты з беларусамі замежжа



Святочная Калядная імпрэза ў Мастацкай галерэі “Універсітэт культуры”



ЮРЫЙ ІВАНОЎ

Павел Сапоцька

**Іван Ждановіч**

Чытачы газеты памятаюць, што ў Мастацкай галерэі “Універсітэт культуры” — а гэта самы цэнтры Мінска, у Палацы Рэспублікі — праходзіла сёлета выстава “Зора і Вітаўт”. Кажучы пра тое ў інтэрв’ю для часопіса “Беларусь. Belarus” (“Прыгожае люстэрка галерэі” — 2017, №9), яе дырэктар, магістр культуралогіі, выкладчык Універсітэта культуры і мастацтваў Павел Сапоцька падкрэсліў: задума выставы з’явілася дзякуючы стасункам з калектывам рэдакцыі газеты “Голас Радзімы”. І ўдакладніў: “Калі набліжаўся чарговы З’езд беларусаў свету, мы абмяркоўвалі: што б цікавае прадставіць? Выйшлі на Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”, канкрэтызавалі задуму. Былі ў нас ідэі наконт мастацкай выставы, а ўрэшце вырашылі абмежавацца дакументальнай, прысвечанай вядомым дзеячам беларускай дыяспары ў ЗША — Зоры і Вітаўту Кіпелям”.

Галерэя была створана ў 2002-м і перададзена Беларускаму дзяржуніверсітэту культуры й мастацтваў. Дзейнасць яе скіраваная на падтрымку розных творчых ініцыятыў, у тым ліку й юных талентаў. З сёлетніх праектаў выклікала немалы грамадскі рэзананс, напрыклад, выстава пясочнай графікі — міжнародны праект з удзелам амаль 40 аўтараў з Беларусі, Украіны, Расіі, Малдовы і Літвы. Па словах Паўла Сапоцькі, бадай што палова галерэйных праектаў — міжнароднага ўзроўню: “Мы ладзілі праграмы з творцамі, а таксама й арганізацыямі, установамі культуры й адукацыі, дыппрадстаўніцтвамі, творчымі суполкамі з розных краін: Расія, Польшча, Літва, Латвія, Эстонія, Украіна, Славакія, Германія, Італія, Іран, Ізраіль... Прайшла нядаўна сумесная выстава з Амбасадай Японіі, быў цікавы праект з Выдавецкім домам “Звязда” пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі з Амбасадай Кітая”.

У Галерэі ёсць дамоўленасці з амбасадамі Эквадора, Індыі, Палестыны, Расіі ды Італіі. Нядаўна распачаўся праект “Беларускія таленты ў свеце” — гэта спроба прыгожа паказваць на Бацькаўшчыне творчасць беларусаў, што жывуць у розных краінах. А такія творцы ёсць і ў Індыі, Эквадоры... Нядаўна ж Павел даслаў у рэдакцыю артыкул пад рабочай назвай “Мінск — Масква: творчы вечар Фёдара Баравога і Валерыя Калінічэнкі” — мяркуем выдаць яго ў бліжэйшы час. Абодва творцы — пісьменнікі, прычым ураджэнец Буда-Кашалёўскага раёна ( і ягоны Ганаровы грамадзянін) Валеры Калінічэнка жыве ў Маскве, ён член Саюза пісьменнікаў і заслужаны работнік культуры Расіі. Зрэшты, пачытаеце самі. Павел засяроджвае ўвагу: Культурна-асветніцкая праграма “Беларускія таленты ў свеце”, заснаваная рэдакцыямі газеты “Голас Радзімы”, часопіса “Беларусь. Belarus” і Мастацкай галерэяй “Універсітэт культуры” — паспяхова стартавала. Быў у галерэі ў 2016-м і праект з Дабрачынным фондам беларуса з Санкт-Пецярбурга Вячаслава Заранкова “Созидающий мир” — выстава “Беларусь вачыма піцерскіх мастакоў”, да Дня Незалежнасці Беларусі. А ў жніўні 2016-га прайшла выстава да 140-х угодкаў Станіслава Жукоўскага па выніках пленэра, які праходзіў у Пружанскім раёне. Тады галерэя працавала супольна з піцерскім аб’яднаннем “Перасоўнікі XXI стагоддзя”, якое ўзначальвае Валеры Выбаржанін.

У планах Галерэі — шырэй прадстаўляць у Беларусі творчасць беларускіх мастакоў замежжа. Павел марыць далучаць да праектаў і амбасады. Скажам, “адпрацаваць” такі фармат мастацка-дакументальных выстаў, як “Беларусы ў Малдове” і “Малдаване ў Беларусі”. Дарэчы, у Кішынёве даўно і плённа працуе мастак-беларус Вячаслаў Ігнаценка, прыгожа заявіла пра сябе і фотамастачка Ганна Мазур: у яе была персанальная фотавыстава. Пісалі мы пра мастачку з Францыі з беларускімі родавымі каранямі Ларысу Нуры-Шакінко. З намі распачаў супрацу мастак, кіраўнік Растоўскай рэгіянальнай грамадскай суполкі “Саюз беларусаў Дону” Уладзімір Банцэвіч, які родам з Палесся, з-пад Пінска. Карацей — паказаць ёсць што. І мы спадзяемся, што ў Новым годзе з Мастацкай галерэяй “Універсітэт культуры”, з яе маладым, ініцыятыўным дырэктарам, са спрыяннем беларускіх суполак замежжа — усім нам разам шмат удасца зрабіць на карысць Бацькаўшчыны.

АБРЫСЫ БУДУЧЫНІ

# Цёплыя зімы, гарачыя леты



Беларускія кавуны — гэта ўжо салодкая рэальнасць

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Мяркуючы па карце, у розных шыротах планеты пацяпленне клімату выявіцца па-рознаму. Для адных краін стане бедствам засуха і неўраджай, для другіх — магутныя паводкі, для трэціх — пажары. У Беларусі, сцвярджаюць ужо нашы навукоўцы, “пацяпленне клімату ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі да ярка выяўленых негатыўных з’яваў не прывядзе”. І яшчэ: “Магчыма, будзе нават больш пазітыўных момантаў. Дзякуючы працягламу спякотнаму лету і дастатковай увільготненасці глебы беларусы змогуць збіраць па два ўраджаі за сезон”. І айчынныя энергетыкі настроены аптымістычна: “Цяперашняе падвышэнне тэмператур нясе для нашай краіны нямала добрага”. Бо цёплыя зімы — гэта ж эканомія энергарэсурсаў. А нам пара ўжо выбіраць кандыцыянеры, бо ўлетку анамальная спякота, магчыма, будзе доўжыцца не тыдзень, а як на Украіне: месяц, а то й два.

“Калі клімат змяніць нельга, то да яго трэба адаптаваць нашу сельскую гаспадарку”, — кажуць беларускія аграрыі дый асабліва не чакаюць ад мора пагоды. За апошнія гадоў 20 ім удалося амаль у два разы павысіць ураджайнасць збожжавых. Павелічэнне вегетацыйнага перыяду (амаль на месяц!) дало магчымасць сельгасаграрыям увесці ў абарот новыя культуры: кукурузу, сою, прасо. Шырока пайшла на палі пайза — кармавая культура, якая вытрымлівае працяглую засуху і здольная даваць некалькі ўкосаў за сезон. Зерне пайзы — як у проса, прыдатнае на корм свойскай жывёлы й птушкі, а зялёную масу, сена й салому ядуць каровы, коні. Укараняецца ў вытворчасць соя, азімы ячмень, пашыраюцца пасевы рапсу. Дарэчы, рапс — гэта стэпавая расліна з велізарным патэнцыялам. Сёння гэта найкаштоўная біядабаўка да камбікармоў для жывёл, крыніца для атрымання біядызелю. У Светлагорскім раёне Гомельшчыны адна з гаспадарак паспяхова займаецца сланечнікам, а пад Гомелем гаспадаркі вырошчваюць зялёны гарошак і спаржавую фасолю.

І мой сусед, са стажам дачнік, з аптымізмам глядзіць у будучыню: “Цяпер пацяпленне клімату заўважна і ў мяне на стале”. На дачы ў яго — амаль Краснадарскі край: ёсць бахча, вінаграднік, арэшнік. З павышэннем сярэднегадавых тэмператур прыходзяць новыя культуры на прысядзібныя ўчасткі. Сёння ў Беларусі нікога не здзівіш мясцовым балгарскім перцам, баклажанамі, пекінскай капустай, грэцкімі арэхамі. Знаўцы кажуць, што арэхі беларускай селекцыі пераўзыходзяць па якасці прывазныя. Не першы год растуць у нас экзатычныя для Беларусі кавуны — у тым ліку й на палях каля прэзідэнцкай рэзідэнцыі “Дразды”. Сам жа Прэзідэнт у 2014-м сабраў там ураджай кавуноў, якому маглі б пазайздросціць астраханскія бахчаводы: мяркую, кансультанты былі добрыя. Вырошчваннем карысный ягады займаюцца гаспадаркі ў Мінскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцях. Культура дае неблагі прыбытак: рэнтабельнасць — да 200 працэнтаў!

Пацяпленне клімату радуе і аматараў вінаграду. Раней у нас ён рос, ды салодкіх ягад было малавата. Праз гадоў 50-100 пры такіх тэмпах пацяплення Беларусь можа ператварыцца ў краіну вінаградарства: трэба ў малдаван ды грузінаў досвед пераймаць. У Пінскім раёне вырошчваюць вінаград для прамысловага выкарыстання. Гарачае сонца на Гомельшчыне спеліць абрыкосы, персікі, ківі, на соткі прыйшла й дыня.

Ну а як жа пальмы-фінікі, манга, бананы? Пажывем — пабачым. Дарэчы, у цэнтры Мінска садоўнік-эксперыментатар ужо шмат гадоў вырошчвае трапічныя расліны, паспяхова адаптуе іх да нашых умоў. Ён, як і я, не ведае: якая будзе Беларусь праз сто гадоў. Я, паміж намі, не надта веру ў доўгатэрміновыя прагнозы кліматолагаў. Заўважце: яны й самі называюць свае прадказанні на далёкую перспектыву няйначай як “верагодныя тэндэнцыі”, у якіх заўсёды ёсць мноства “калі”. Несумненна, у змяненні клімату ёсць частка нашай віны. Ды калі мы ўсе разам перастанем карыстацца гаручым, спынім заводы, перасядзем на равары… Думаеце, паўплываць на ўмовы надвор’я ўдасца? І немагчыма ж павесці ўсіх жыхароў планеты на... барацьбу з глабальным пацяпленнем. Таму, мяркую, варта нам асвойвацца ў новых умовах, быць дзейнымі аптымістамі, наладжваць сваё жыццё так, каб атрымліваць ад яго радасць — і дзяліцца ёю з іншымі. Чаго й жадаю ўсім нам у Новым годзе!

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў
**Адрас рэдакцыі:** Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 287 16 91
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 287 15 32; факс: +375 17 287 15 26
**E—mail:** golas_radzimy@tut.by
**Аб’ём выдання:** 1 друк. арк.
**Тыраж:** 1945. **Заказ:** 1801
**Час падпісання ў друк:** 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.
© “Голас Радзімы”, 2017